Крыніца.info

03.10.2018

# Доктар Скот Кэрал: археалагічныя знаходкі і манускрыпты пацвярджаюць даставернасць Бібліі

Э.Дзвінская, фота аўтара




У межах дзейнасці міжнароднай выстаўкі “Беларусь і Біблія” прадстаўнік “Групы даследвання рукапісаў”, археолаг і гісторык доктар Скот Кэрал выступіў з лекцыяй, якая выклікала зацікаўленасць у выкладчыкаў і студэнтаў Інстытута тэалогіі, навукоўцаў і ва ўсіх прысутных.

Наведвальнікі выставы ставяцца з вялікай сімпатыяй да шаноўнага госця, які, нягледзячы на стомленасць, штодня апавядае пра гісторыю старажытных манускрыптаў, не адмаўляе нікому ў захапляльнай экскурсіі і дае патрымаць ў руках скруткі Торы, якім 300 гадоў.

У сваёй лекцыі доктар Скот Кэрал прадэманстраваў на экране і пракаментаваў шэраг сусветных помнікаў археалогіі і культуры, якія з’яўляюцца крыніцамі для вывучэння гісторыі Бібліі і пацвярджаюць яе даставернасць.

Уплывовы і аўтарытэтны навуковец распавёў пра раскопкі, манументы і рукапісы, у якіх захоўваецца інфармацыя, ідэнтычная апісаным у Бібліі падзеям. Доктар Скот прывёў шэраг важных фактаў, якія гавораць пра дакладнасць Святога Пісьма і рэальнасць

гістарычных падзей. Ён дазволіў прасачыць цесную сувязь паміж гісторыяй старажытнага свету, археалогіяй і літаратурай.




Распавядаючы пра раскопкі, доктар Скот адзначыў гарады, якія ўзгадваліся ў Старым і Новым Запаветах. Сярод такіх гарадоў ён назваў Ур, Гесен (Гашэн), Ерыхон і Ерусалім, Ніневію і Самарыю, Лахіш і Вавілон, Асірынх і Карынт, Эфес. Археолагі здолелі даследваць гэтыя мясцовасці.

Калі Палац цара Давіда знайшлі ў Ерусаліме, габрэйскі археолаг запытаў: адкуль вы ведалі, дзе капаць? Спецыяліст, якая праводзіла раскопкі, сказала, што яна следвала ўказанням з Бібліі.

На месцы горада Ніневіі была знойдзена старажытная царская бібліятэка. У ёй знайшлі Кодэкс Хамурапі і эпас пра Гільгамеша, які распавядае пра патоп. У горадзе Эфесе была знойдзена трэцяя па велічыні бібліятэка ў свеце. Важныя знаходкі былі зробленыя ў Карынце ля манастыра святой Кацярыны і гары Сінай.

Іншымі крыніцамі інфармацыі з’яўляюцца помнікі, манументы, рэльефы і пячаткі, на якіх захавалася інфармацыя пра цароў, што ўзгадваюцца ў Старым і Новых Запаветах.

“У Старым Запавеце ўзгадваюцца 29 цароў з 10 народаў, — распавёў доктар Скот Кэрал. 57 уладароў пералічваецца ў Старым і Новым Запаветах. — Іх імёны засталіся запісанымі на розных мовах на манументах, барэльефах, абелісках, грабніцах адпаведных эпох. Да такіх належаць грабніца цара Осіі, стэла Тэль-Дана, прызма цара Сенахерыба. На адным з рэльефаў запісаны назвы 187 гарадоў, заваяваных фараонам. Захаваліся срэбныя амулеты з раннімі тэкстамі з Пісання, надпіс Понція Пілата на камяні, надпіс праконсула Галіёна. Таблічак з Вавілону знойдзена больш за 5 тысяч”.




Да трэцяй катэгорыі належаць непасрэдна рукапісы. У пячорах Кумрана былі знойдзены дзясяткі тысяч манускрыптаў. Вялікую каштоўнасць прадстаўляюць сувоі Мёртвага мора. Захавалася 300 фрагментаў з Бібліі, якія датуюцца 250 г. да н.э. – 70 г. н.э.

У Каірскай Генізе (памяшканні, дзе захоўваюцца копіі асобнікаў Старога Запавету, якія саслужылі сваю службу) было знойдзена 250.000 рукапісаў. Іх вывучалі дзве даследчыцы, сёстры з Кембрыджскага універсітэта.

Непасрэдна сам доктар Скот Кэрал знайшоў у Егіпце ў масцы муміі тэкст на грэчаскай мове, які належыць да 1 Кнігі Царстваў. Іншай каштоўнай знаходкай стала Пасланне апостала Паўла да Карынцянаў.

“Мы шчыльна супрацоўнічаем з навукоўцамі, якія дапамагаюць нам расшыфроўваць і прачытваць рукапісы”, — сказаў доктар Скот Кэрал.

Наведвальнікі выставы сардэчна падзякавалі аўтарытэтнаму навукоўцу за змястоўную лекцыю.